Ваўкавыскае раённае літаратурнае аб'яднанне "Муза"

“Спачатку было Слова…”

Менавіта з гэтага Слова, якое трэба разумець як дадзенае Богам, пачаў свой шлях у літаратуру кожны з сяброў нашага літаратурнага аб’яднання “Муза”, створанага ў Ваўкавыску. І сапраўды, спачатку было слова… Тое самае сардэчнае слова, якое паэтычнай птушкай нараджаецца ў сэрцах мясцовых паэтаў і імкнецца да душаў усіх, хто здольны яго пачуць і зразумець…

Тамара Мазур

27 сакавіка2007 года у фае Ваўкавыскага кінатэатра “Юнацтва” сабраліся мясцовыя аматары паэзіі, большасць з якіх ужо друкавалі свае вершы ў раённай газеце “Наш час” пад рубрыкай “Ваўкавышчына літаратурная”, якую тады рыхтавала рэдактар аддзела маркетынгу і рэкламы, паэтэса Тамара Мазур. Яна ж дамовілася аб месцы для такой сустрэчы, бо рэдакцыя “раёнкі” па тым часе размяшчалася ў вельмі цесным памяшканні. У холе “Юнацтва” было не толькі прасторна, але вельмі ўтульна. Мы ўсе з задавальненнем пачыталі свае вершы, некаторыя з нас – выканалі музычныя кампазіцыі пад гітару, шчыра пагутарылі пра тое, як нам “не пропасть по одиночке”. Бо ўжо тады рэклама забірала ўсё больш газетнай плошчы. Тамара Мазур паведаміла, што ў такіх умовах добра, калі “Ваўкавышчына літаратурная” будзе выходзіць у свет хоць бы раз у квартал. А гэта значыць, што друкаванымі могуць быць толькі самыя лепшыя творы. Каб не было ніякіх крыўдаў, Тамара Міхайлаўна прапанавала стварыць літаратурнае аб’яднанне і на яго паседжаннях калектыўна выбіраць вершы ў друк. Вечарына атрымалася такая прыемная і нечакана змястоўная, што мы вырашылі збірацца кожны першы аўторак месяца. Стаць членам нашага літаб’яднання мог кожны жадаючы, але ў першую чаргу Тамара Мазур запрасіла ў суполку тых, хто хоць аднойчы друкаваўся на старонках газеты “Наш час”. Асаблівай каштоўнасцю такіх сустрэч была сяброўская падтрымка, якая сыходзіла ад старэйшых да маладых.

ЕСЛИ "ЗВЕЗДЫ" ЗАЖИГАЕТ "НАШ ЧАС", ЗНАЧИТ, ЭТО НУЖНО ЧИТАТЕЛЯМ!

Недавно в кабинете главного редактора "Нашего часа", за столом, где обычно проходят редакционные "планерки", в конце рабочего дня собрался новый состав творческих людей. Назавтра за этим же столом приступил к обсуждению тем очередных номеров газеты прежний коллектив журналистов.

Что это было? Нет, никакой попыт-

После чего за чаепитием авторы читали свои стихи, а Тамара Кощевая исполнила песню "Ваўкавыская газета", припев которой подхватили все:

...Запомніць лёгка вам назву гэту,
Яна працуе, каб заўжды цікавіць вас!
Чытайце, людзі, сваю газету,
Сваю газету ваўкавыскую "Наш час"!..

После этого предприниматель Александр Морзало призадумался и многозначительно заявил: "Если "Наш час" может иметь свою песню, то почему торго-

ки "переворота" в штате редакции не происходило.

Просто пришло время поздравить победителей конкурса "Наш час" в стихах и песнях". По этому поводу был накрыт "сладкий стол". А к нему, кроме непосредственных "виновников" этого мероприятия, были приглашены и наши друзья, предоставившие поэтическим талантам достойные призы.

Но в самом начале свое слово благодарности сказала главный редактор Валентина Михайловна Курилик. Она отметила, что, объявляя конкурс "Наш час" в стихах и песнях", редакция не ожидала такого большого потока читательских писем с признаниями в любви родной "районке". Многие были напечатаны. Но самые луч-

Артыкул у газеце “Наш час”

Я вельмі ўдзячная Тамары Мазур за тое, што яна з такой лагоднасцю і небывалым тактам навучыла мяне працаваць з кожным радочкам у маіх вершах, прабудзіла ў маім сэрцы пачуццё годнасці за непаўторнасць і музычнасць радзімага маўлення. Дзякуючы ёй мае вершы сталі прыдатнымі для друку ў альманахах і часопісах. Ні дзіва, што і першыя вершы большасці з нашых паэтаў былі надрукаваны менавіта ў рубрыцы "Ваўкавышчына літаратурная" раённай газеты "Наш час". З гэтага перыядычнага выдання пачынаецца наша гісторыя, з гэтым перыядычным выданнем цесна пераплятаецца лёс нашага літаратурнага аб'яднання. Ды не буду забягаць наперад.

Настасся Токарава-Самушчык

У снежні таго ж года Тамара Мазур прымае рашэнне пераехаць у слаўны горад Гродна і працягнуць журналісцкую дзейнасць у газеце "Перспектыва". Паўстае сур'ёзнае пытанне аб далейшым існаванне літаратурнага аб'яднання, якое было ёю заснавана. Ці то жартам, ці то ў сур'ёз сваю справу яна прапануе працягнуць мне – яшчэ зусім маладой і толькі пачынаючай паэтцы – Настассі Токаравай-Самушчык. Зусім не ўяўляючы, што мяне чакае і да чаго ў выніку ўсё гэты прывядзе, я згадзілася і завалодала "каштоўным" спісам усіх членаў літаратурнага аб'яднання. І ў студзені 2008 года літаратурнае аб'яднанне сабралася зноў: адноўленым складам і з новым кіраўніком.

Выступленне ў папраўча-працоўнай установе. Студзень, 2008 г.

Ужо на першай нашай сустрэчы мы дамовіліся называцца Ваўкавыскім раённым літаратурным аб'яднаннем "Муза", пашырыць межы нашай дзейнасці і дазволіць нашым вершам не толькі друкавацца на старонках газет, але і гучаць на літаратурных сустрэчах з чытачамі бібліятэк, школьнікамі і іншымі аматарамі паэзіі.

Адметна, што ў тым жа студзені мне і паэту з вёскі Вярэйкі Ваўкавыскага раёна Віктару Курловічу давялося ўдзельнічаць у фестывалі "Паэзія – душы рух" у г.Гродна. Пазней (у 2012 годзе) мы сталі лаурэатамі гэтага фестывалю і членамі Гродзенскага абласнога літаратурнага аб'яднання.

Вось так усё і закруцілася – творчасць накрыла нас хваляю пазітыву і безыпуннымі "гастролямі". Мы выступалі ў школах (гарадскіх і вясковых), у цэнтры творчасці дзяцей і моладзі, у бібліятэках, храмах і, нават, у нашай ваўкавыскай папраўча-працоўнай установе. Нашы імкненні і дасягненні друкаваліся ў артыкулах на старонках газеты "Наш час".

У Вярэйкаўскай сярэдняй школе: Настасся Токарава-Самушчык, Юлія Кавальчук, Віктар Курловіч. Снежань, 2008 г.

У Сярэдняй школе № 7 г.Ваўкавыска. Верасень, 2008 г. Верасень, 2009 г.

23 студзеня 2008 г. Наш час

Клир и мир

ВО ИМЯ ДОБРА

В наше суровое время, когда основы воспитания дети черпают из телевизионных передач, а идеалы, которым стремятся подражать, являются далеко не образцами нравственности и культуры, очень важны мероприятия, которые прививают подрастающему поколению чувства доброты, милосердия и духовной красоты. Именно такое было организовано настоятелем Свято-Покровской церкви Евгением Красовским.

20 января здесь прошел вечер духовной поэзии, на который были приглашены ученики воскресных школ этой церкви и Свято-Петро-Павловского собора, а также местные поэты. Ребята читали наизусть оды Ломоносова и Державина, стихи Пушкина, Блока, Фета. Свой комментарий к ним давал отец Евгений. Много интересного можно было узнать об истории Рождества Христова и Крещении. Анастасия Токарева, Ирина Суханова и Мария Смурага прочитали собственные стихи.

Классическая музыка в качестве музыкального фона, горящие свечи создавали особую атмосферу теплого вечера в православной семье. Хочется надеяться, что это мероприятие положит начало доброй традиции, и такие православные вечера станут частью нашей жизни.

Анастасия САМУЩИК.

17 снежня 2008 г.

Из почтового ящика

ТВОРЧЕСТВО НЕ ЗНАЕТ ГРАНИЦ

Творчество, как известно, не знает границ. Как не знает границ и наше стремление поделиться им со всеми желающими. Мы — это участники волковысского литературного объединения «Муза». Стартовав с выступлениями еще в феврале нынешнего года, мы продолжаем знакомить любителей поэзии с нашими стихами. На этот раз побывали в Верейковской средней общеобразовательной школе, где нас встретил полный зал зрителей. И вновь звучали стихи на самые разнообразные темы на белорусском и русском языках, а классическая музыка, создававшая фон, помогала ощутить поэзию всей душой. Впервые свои стихи со сцены читала юная участница литобъединения Юлия Ковальчук. Кроме того, зрители смогли услышать песню «Верейки», написанную на стихи Виктора Курловича. Разыгрываемые юмористические диалоги и составленное совместно со зрителями буриме сделали мероприятие еще более ярким и запоминающимся.

Анастасия ТОКАРЕВА-САМУЩИК.



Из почтового ящика

ПУТЬ К СЕРДЦУ – ЧЕРЕЗ СЛОВО

Талантливых людей можно встретить в самых неожиданных местах. В этом члены районного литературного объединения "Муза" убедились, посетив исправительное учреждение ИК-11. Перед аудиторией заключенных выступили Борис Перовский, Мария Мисюк, Павел Савко, Тамара Игнатович, Татьяна Пыжик, Надежда Болтрукевич и Анастасия Токарева.

Поэтическая программа, подготовленная "музовцами", включала стихи самой разной тематики, начиная любовной лирикой и заканчивая глубокомысленными поэтическими строками, а прозаик Надежда Болтрукевич прочла один из своих рассказов "Проездом в жизнь". Поэты нашлись и среди заключенных. Свои стихи, прекрасные, образные и очень душевные, они тоже читали со сцены и интересовались мнением гостей.

Следующая встреча запланирована на апрель, ведь слово, тем более слово поэтическое, способно растопить лед в сердце любого человека.

Анастасия САМУЩИК.

Из почтового ящика

ТВОРЧЕСКИЕ ВСТРЕЧИ

Что может быть приятней встречи с интересными людьми? А если эти люди еще и творческие личности — тогда встреча превращается в увлекательнейшее мероприятие.

Именно такое мероприятие и прошло на днях в районном Доме детского творчества. Его инициатором стало областное литературное объединение учителей-поэтов под руководством Лилии Шелешко. Зрители, которыми являлись ученики разных школ нашего города, смогли услышать стихи на русском и белорусском языках, продемонстрировать успехи в стихосложении и потренироваться в рифмовании строк. Свои же прекрасные произведения читали и исполняли Федор Чичкан (член Союза писателей и Союза журналистов), Петр Семинский (член Союза писателей), руководитель Гродненского клуба поэтов и бардов "Надежда" при Доме учителя Наталья Горбачева и представители этого клуба Ирина Петрова и бард Нелли Петрухина, организатор волковысского литобъединения "Муза" Анастасия Токарева и члены объединения Павел Савко, Виктор Курлович и Татьяна Пыжик.

Знакомили публику со своими творениями и юные поэты-школьники: девятиклассница из г. Гродно Екатерина Акимова и одиннадцатиклассница из нашего города Юлия Нинард. Философская лирика сменялась юмористическими шаржами, стихи — песнями, и все вместе создавало приятную атмосферу доброты и радости общения.

Анастасия САМУЩИК.

Зразумела, што існаванне Ваўкавыскага раённага літаратурнага аб'яднання "Муза" ніякім чынам не перашкаджала паэтам і пісьменнікам, якія з'яўляліся яго членамі, працаваць і праяўляць свае таленты за межамі дзейнасці літаратурнага аб'яднання. Некаторыя з паэтаў друкаваліся ў абласных, рэспубліканскіх і, нават, замежных перыядычных выданнях. Хтосьці выдаваў свае зборнікі вершаў, ці выступаў на літаратурных сустрэчах, як самастойны паэт ці пісьменнік. Творы нашых паэтаў былі пакладзены на музыку і гучалі, як песні.

Увогуле, выступленні нашага літаратурнага аб'яднання нельга было б назваць звычайнымі: заўжды прысутнічала нейкая цікавая адметнасць, незвычайнасць, якую гледачы і слухачы маглі б захаваць у сэрцы і ў памяці. Мастацкае чытанне вершаў на рускай, беларускай і польскай мовах пад класічную музыку, жартоўныя дыялогі вядучых, сумесна з гледачамі складзенае бурымэ… Сумаваць на нашых сустрэчах не было ніякай магчымасці!

Фестываль “Масалянскія салаўі-2012”

Фестываль “Масалянскія салаўі-2014”

Аднак, па некаторых аб’ектыўных прычынах у перыяд з 2010 па 2014 гады Ваўкавыскае раённае літаратурнае аб’яднанне “Муза” было вымушана прыпыніць сваю дзейнасць. Паэты больш не збіраліся, як літаратурная суполка, але ж працягвалі пісаць, друкаваць і дэкламаваць свае вершы. Толькі некалькі разочкаў здарылася нам нібы зорачкай мільгануць на значных літаратурных мерапрыемствах паэтычнага небасхілу ў якасці літаратурнага аб’днання. Такімі шчаслівымі імгненнямі, напрыклад, былі сустрэчы на паэтычным фестывалі “Масалянскія салаўі” у аграгарадку Масаляны Бераставіцкага раёна ў 2012 і ў 2014 годзе.

Сумна было майму сэрцу назіраць, што ўсё менш запрашаюць паэтаў у школы, усё радзей друкуюцца вершы мясцовых паэтаў у рубрыцы “Ваўкавышчына літаратурная”. Тым больш не было падтрымкі пачынаючым паэтам, тым, хто яшчэ не быў здольны ствараць творы для друку. Тым, хто, як я калісьці, шукаў свой творчы шлях і меў патрэбу ў падтрымцы больш сталых паэтаў-сяброў. Прызнаюся, што і ў мяне не хапала моцы падняць”Музу” з руінаў, ці пачаць усё нанава. Патрэбны быў штуршок, які б скалыхнуў і прымусіў грамадскасць – творчую і інтэлегентную грамадскаскасць – узняць пытанне аб актывізацыі літаратурнага руху на Ваўкавышчыне.

І гэты шчаслівы момант не прымусіў сябе чакаць. У снежні 2014 выходзіць з друку, а 6 лютага 2015 года – урачыста прэзентуецца альманах “Люблю цябе, мая старонка”, у якім друкуюцца вершы аб радзіме і Ваўкавыскай зямлі амаль трох дзясяткаў паэтаў, якія жылі ці працавалі на нашай бласлаўеннай зямлі. Адметна, што складальнікам альманаха стала Валянціна Міхайлаўна Курылік – рэдактар раённай газеты “Наш час”. У альманах увайшлі вершы і ўдзельнікаў “Музы”: Марыны Бабіч, Галіны Здановіч-Бойчанка, Тамары

Кашавой, Івана Кударонка, Віктара Курловіча, Барыса Пяроўскага, Святланы Свірыдавай, Настассі Токаравай-Самушчык.

Пачакаўшы ініцыятывы ад іншых, я самастойна ўзялася за былую справу. Распрацаваўшы праект адраджэння літаратурнага руху на Ваўкавышчыне, атрымаўшы падтрымку мясцовых улад і стварыўшы на базе ДзУА "Ваўкавыскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі" аб'яднанне па цікавасцях для дзяцей "Натхненне", 28 жніўня 2015 года я сабрала Ваўкавыскае раённае літаратурнае аб'яднанне "Муза".

Рухацца наперад бывае даволі цяжка, асабліва, калі папярэдні вопыт быў не вельмі ўдалы. Тым не менш, крок за крокам, мы працягваем нашу дзейнасць. Ваўкавыскае раённае літаратурнае аб'яднанне "Муза"зноў распачало сваю творчую працу. Хтосьць з былых "музаўцаў" не мае магчымасці ці жадання дзейнічаць разам з намі: ім мы жадаем поспехаў. Але ёсць і тыя, хто далучыўся да нас толькі на прыканцы года. За гэты час мы паспелі здзейсніць акцыю "Пранікаючы ў дзіцячыя сэрцы" (верасень, 2015г): выступаючы перад дзіцячай аудыторыяй ва ўсіх гарадскіх школах Ваўкавыска, мы даносілі да іх паэтычнае Слова – Слова добрае, Слова вечнае. Нашы паэты наведалі свята, прысвечанае Дню пісьменнасці і друку, у Шчучыне (верасень, 2015г), літаратурнае кафэ "Три свечи" у Гродна (верасень, кастрычнік 2015г.). Разам з юнай паэткай- пяцікласніцай Ксеніяй Скурат мы знялі відэярэпартаж "На шляху натхнення…", прысвечаны таленавітай ваўкавыскай паэтцы Марыне Бабіч. Да таго ж, мне давялося паспяхова паўдзельніцаць у конкурсе Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ "Песняры гарадзенскай зямлі" (снежань 2015г.).

Урачыстае ўручэнне альманахаў аўтарам у актавай зале Ваўкавыскага райвыканкама 6 лютага 2015г.

Прэзентацыя альманаха ў чытальнай зале гарадскога філіяла Ваўкавыскай раённай бібліятэкі.

24 студзеня 2016 года ў чытальнай зале Ваўкавыскай раённай цэнтральнай бібліятэкі адбылася літаратурная сустрэча “С “Музой” по жизни…”. Прыхільнікі паэтычнага слова мелі магчымасць пачуць вершы на рускай, беларускай і польскай мовах ад Тамары Кашавой, Тамары Ігнатовіч, Марыі Місюк, Віктара Курловіча, Настассі Токаравай-Самушчык, Галіны Смок. Упершыню уласныя вершы дэкламавалі Віктар Семак і вучаніца 7 класа СШ № 3 г.Ваўкавыска – Аляксандра Развадоўская. Гучалі музычныя кампазіцыі. Разам з гледачамі было створана гумарыстычнае ”бурымэ”.

СВИДЕТЕЛЬСТВО

о наведении
моста Дружбы и Творчества
между
общественным литературным
объединением "Надежда" (г.Гродно)
и
районным литературным
объединением "Муза" (г.Волковыск)

Руководитель общественного литературного объединения "Надежда" — Калачик Михаил Михайлович

Организатор районного литературного объединения "Муза" — Токарева-Самущик Анастасия Александровна

17 сентября 2015 г.

I-ИС № 0000004

Мы наладжваем "масты сяброўства і творчасці" з літаратурнымі аб'яднаннямі і гурткамі ў іншых гарадах, плануем далейшыя літаратурныя сустрэчы і публікацыі. Ці атрымаецца ў нас усё тое, што мы запланавалі? Яшчэ пабачым. Галоўнае, што мы ёсць, мы робім добрую справу і дорым нашу творчасць тым, каму гэта патрэбна.

28 кастрычніка 2015 г. ВітаНАС

НЕ ХЛЕБАМ АДЗІНЫМ

З "Музаю" ў новае жыццё

Не так даўно адбыліся ўрачыстасці і творчыя сустрэчы, прысвечаныя Нацыянальнаму святу — Дню беларускага пісьменства і друку. Хтосьці пабываў і цікава адзначыў яго ў Шчучыне, а камусьці пашчасціла дакрануцца да дзівоснага маўлення ў родным Ваўкавыску на творчых спатканнях і вечарынах. Мы, паэты Ваўкавыскага раённага літаратурнага аб'яднання "Муза", таксама не абмінулі гэтыя падзеі.

Нагадаем, што яшчэ ў сакавіку 2007 года паэткай Тамарай Мазур было створана літаратурнае аб'яднанне, да якога далучаліся ўсе паэты Ваўкавышчыны, хто хоць аднойчы друкаваўся на старонках газеты "Наш час". У той час мы збіраліся ў фае кінатэатра "Юнацтва" адзін раз у месяц, каб падзяліцца сваёй творчасцю з калегамі і падрыхтаваць шэраг вершаў для літаратурнай старонкі ў газеце. У снежні таго ж года Тамара Мазур пераехала ў Гродна, а паўнамоцтвы арганізатара літаратурнага аб'яднання і спіс ваўкавыскіх паэтаў з іх кантактнымі данымі перадала мне. У студзені 2008 года аб'яднанне з новым арганізатарам сабралася зноў. Па ініцыятыве паэтаў мы прынялі назву "Муза".

Аднаўленае літаратурнае аб'яднанне адным з накірункаў сваёй дзейнасці абрала асветніцтва. З задавальненнем прымаючы запрашэнні, мы знаёмілі з нашай творчасцю навучэнцаў школ і чытачоў бібліятэк, выязджалі з літаратурнымі выступленнямі ў вясковыя школы.

Паступова, не атрымаўшы неабходнай падтрымкі, аб'яднанне прыпыніла сваю дзейнасць, але ж паэты літаратурнага аб'яднання "Муза" друкаваліся на старонках не толькі раённага выдання, але і ў рэспубліканскіх газетах і часопісах, прымалі ўдзел у якасці ганаровых гасцей і лаўрэатаў у паэтычных фестывалях "Паэзія — душы рух" (г. Гродна, 2008 і 2012 гг.) і "Масалянскія салаўі" (Бераставіцкі р-н, 2012 і 2014 гг.), удзельнічалі ў літаратурных сустрэчах сумесна з паэтамі Гродзенскага літаратурнага аб'яднання "Надзея" і Гродзенскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Пасля знакавай падзеі на Ваўкавышчыне — стварэння і прэзентацыі альманаха "Люблю цябе, мая старонка" (у лютым 2015 года) — у паэтычным асяроддзі зноў загаварылі аб неабходнасці аднаўлення літаратурнага аб'яднання. Мной быў распрацаваны праект адраджэння "Музы". Пры падтрымцы райвыканкама, на прыканцы жніўня я зноў сабрала паэтаў на творчую вечарыну. Праект быў разгледжаны, дапрацаваны, і пачалася яго рэалізацыя.

Як і раней, адным з накірункаў працы "музаўцаў" засталася асветніцкая дзейнасць. У сувязі з гэтым, згодна з каляндарным планам рэалізацыі праекта, літаратурным аб'яднаннем "Муза" была праведзена акцыя "Прынікаючы ў дзіцячыя сэрцы". У верасні паэты выступалі ва ўсіх сярэдніх школах Ваўкавыска, знаёмячы са сваёй творчасцю і дзейнасцю "Музы" дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту.

Прыцягнуць увагу звычайнага школьніка да мастацкага слова — задача не з лёгкіх: сучасны прагрэс у некаторых яго праявленнях перашкаджае выхаванню інтэлектуальнай і высока арганізаванай асобы. Але ж вершы, якія мы выбралі для дэкламацыі перад школьнікамі, давалі ім магчымасць фантазіраваць, уяўляць, спачуваць, смяяцца, паразважаць з уласным жыццём. Незвычайным падарункам і момантам чараўніцтва з'явіліся для дзяцей прачытаны мною "Школьны рэп" і складзеныя разам са слухачамі вершы-"бурымэ". Акрамя мяне, сваім натхненнем дзяліліся з дзецьмі Марына Бабіч і Тамара Кашавая, Галіна Смок і Святлана Свірыдава.

Трэба адзначыць гасціннасць СШ № 2, дзе давялося пабываць тройчы. Вельмі прыемнымі і сардэчнымі былі сустрэчы са школьнікамі гімназіі № 1, сярэдніх школ № 4 і № 5.

Мэта нашай акцыі — прыцягнуць увагу дзяцей да літаратуры і творчасці, да мастацкага слова. Перакананы, што светлы след у душы і памяці школьнікаў мы пакінулі. А можа, кагосьці з іх натхнілі на творчасць. Тым больш, што з гэтага года пачаў сваю дзейнасць гурток для будучых паэтаў, пісьменнікаў і журналістаў. Аб'яднанне па цікавасцях "Натхненне" працуе ў ДУА "Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі". Спадзяёмся, што ў хуткім часе наша літаратурнае аб'яднанне папоўніцца новымі асобамі — таленавітымі і актыўнымі маладымі пісьменнікамі.

Настаеся ТОКАРАВА-САМУШЧЫК.

На цяперашні час Ваўкавыскае літаратурнае аб'яднанне складаецца з наступных удзельнікаў.

Марына Віктараўна Бабіч *(1982 г.н.) – адзін з кіраўнікоў народнага інтэлектуальнага клуба "Высокі Волак" пры раённым метадычным цэнтры народнай творчасці. Паэтка. Аўтар трох паэтычных зборнікаў: "Прийти, увидеть, полюбить…»(1997), «Нить любви»(2001), «Соловьиная рать»(2010). Друкавалася ў перыядычных выданнях: "Наш час", "Знамя юности», "Чырвоная змена", "Народный журнал", "Нёман" і інш. З 2003 года – член Саюза пісьменнікаў Беларусі.*

Мікалай Пятровіч Іваноўскі *– беларускамоўны паэт, аўтар вершаў і баек для дзяцей і дарослых. Друкаваўся на старонках газеты "Наш час", "Гродненский химик". У 2015 годзе свет пабачыла яго кніга "Нашчадкі роду Іваноўскіх", прысвечаная творчасці яго брата-мастака. У цяперашні момант ён жыве ў в. Пачуйкі Рэплеўскага сельсавету Ваўкавыскага раёна.*

Тамара Канстанцінаўна Ігнатовіч *(1952 г.н.) – былы настаўнік рускай мовы і літаратуры, пінсіянерка, пражывае ў Ваўкавыску. Рускамоўныя вершы друкаваліся на старонках газеты "Наш час" і навукова метадычнага часопіса "Русский язык и литература".*

Тамара Васільеўна Кашавая *– працаўнік культуры і педагог па тэатральнаму майстэрству. Піша вершы, песні, сцэнарныя распрацоўкі на рускай і беларускай мовах. Пераможца і дыпламант шматлікіх міжнародных паэтычных конкурсаў. Аўтар рамана-паэмы ў вершах "Каханне ваўкалака" і зборніка вершаў "Ваўкавыск – радзімка Беларусі", выдадзенага ў творчай садружнасці з зямлячкай-паэтэсай Тамарай Мазур.*

Віктар Георгіевіч Курловіч *(1955 г.н.) – былы настаўнік фізікі і выхавацель ў санаторнай школе-інтэрнаце. Пенсіянер, жыве ў в.Вярэйкі Ваўкавыскага раёна. Друкаваўся ў перыядычных выданнях, у калектыўным зборніку "Голас надзеі". Аўтар зборніка беларускіх вершаў "Пах медуніцы".*

Марыя Іосіфаўна Місюк *(1940 г.н.) – былы настаўнік пачатковых класаў, пінсіянерка, пражывае ў г.п.Рось Ваўкавыскага раёна. Друкавала свае вершы на рускай, беларускай і польскай мовах у выданні "Наш час" і польскіх часопісах: "Slowo Zycia" і "Glos znad Niemna".*

Святлана Віктараўна Свірыдава *(1967 г.н.) – бібліятэкар, жыве і працуе ў г.п. Рось Ваўкавыскага раёна. Піша вершы на рускай мове. Друкавалася ў ваўкавыскіх выданнях "Наш час" і "Местная газета". Адзін з яе вершаў увайшоў у альманах "Люблю цябе, мая старонка".*

Віктар Эдуардавіч Семак *(1975г.н.) – настаўнік хіміі і біялогіі ў Вярэйкаўскай сярэдняй школе. Вершы на беларускай мове пачаў пісаць і друкаваць нядаўна на старонках "Наш час". Жыве ў в.Вярэйкі Ваўкавыскага раёна.*

Галіна Іванаўна Смок *(1951г.н.) – медыцынскі працаўнік на пенсіі, публікавала вершы і апавяданні на рускай мове ў газеце "Наш час". Жыве ў Ваўкавыску.*

Настасся Аляксандраўна Токарава-Самушчык *(1986 г.н.) – кіраўнік-арганізатар літаратурнага аб'яднання "Муза". Настаўнік пачатковых класаў, педагог дадатковай адукацыі. З 2001 года на старонках раённай газеты "Наш час" і "Местная газета" друкуюцца вершы, артыкулы, апавяданні на рускай і беларускай мовах. Некаторыя вершы ўвайшлі ў зборнікі "Голас надзеі", "Услышь мой голос на заре", "Люблю цябе, мая старонка".*

Гэта нашы пастаянныя ўдзельнікі. Час ад часу да нас далучаюцца і іншыя паэты ці пісьменнікі. Спадзяюся, што хутка наш спіс папоўняць і зусім маладыя паэты – школьнікі.

Настасся Токарава-Самушчык